**Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам**

Т. У. Ганчарова-Цынкевіч
Т. М. Тарасава

# Беларуская літаратура

# Экзаменацыйныя ТЭСТЫ

## для паступаючых у ВНУ





АВЕРСЭВ

Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам

Т. У. Ганчарова-Цынкевіч
Т. М. Тарасава

# Беларуская літаратура

# Экзаменацыйныя тэсты

## для паступаючых у ВНУ



Мінск
«Аверсэв»
2006

ИК-3777
Бібліятэка БДПУ імя М. Танка

УДК 882.6 (075.3)
ББК 84.4Беи
Г19

*Серыя заснавана ў 1999 годзе*

**Ганчарова-Цынкевіч, Т. У.**

Г19 Беларуская літаратура : экзаменацыйныя тэсты для паступаючых у ВНУ / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч, Т. М. Тарасава. — Мн. : Аверсэв, 2006. — 127 с. — (Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам).

ISBN 985-478-841-5.

У дапаможніку змешчаны тэсты па беларускай літаратуры за курс сярэдняй агульнаадукацыйнай школы па праграме Нацыянальнага інстытута адукацыі, праграме ўступных экзаменаў па беларускай літаратуры для ВНУ. Тэсты ўяўляюць сабой комплекс заданняў па частцы А і частцы В, што дасць магчымасць паўтарыць і сістэматызаваць пройдзены матэрыял, аб'ектыўна ацаніць свой узровень ведаў. У канцы кнігі прыведзены правільныя адказы.

Дапаможнік прызначаны для самастойнай падрыхтоўкі вучняў і абітурыентаў да ўступных экзаменаў у ВНУ.

**УДК 882.6 (075.3)**
**ББК 84.4Беи**

**ISBN 985-478-841-5**

© Ганчарова-Цынкевіч Т. У., Тарасава Т. М., 2006
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2006

# АД АЎТАРАЎ

Дапаможнік змяшчае экзаменацыйныя матэрыялы па беларускай літаратуры, прапанаваныя абітурыентам пад час уступных экзаменаў у 2005 годзе. Тэставыя заданні складзены на падставе праграмы ўступных экзаменаў па беларускай літаратуры для ВНУ Рэспублікі Беларусь і маюць на мэце ахапіць увесь матэрыял па беларускай літаратуры за курс сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Тэсты дадуць магчымасць школьнікам і абітурыентам праверыць сваё веданне біяграфій пісьменнікаў, жанрава-стылявых адметнасцей іх твораў, асноўных тэарэтычных паняццяў літаратуры, з якімі яны пазнаёміліся ў школе.

Тэсты згрупаваны парамі, у кожнай пары тэстаў пытанні сфармуляваны аднолькава, а вось варыянты адказаў альбо розныя, альбо змешчаны ў іншай паслядоўнасці. Такая структура дасць магчымасць больш плённага кантролю і самакантролю ведаў, паспрыяе развіццю пазнавальнай актыўнасці школьнікаў, скіраванай на паглыбленне і сістэматызацыю ведаў. Тэставыя заданні шматузроўневыя: ёсць тэсты рэпрадуктыўнага характару, скіраваныя на ўзнаўленне прачытаных твораў, і тэсты аналітычнага тыпу, дзе патрэбна самастойна разбірацца ў тэматыцы, праблематыцы, у характары эстэтычнага пафасу твораў, маральна-этычных канфліктах. Натуральна, шкала ацэнкі ведаў (у балах) залежыць ад узроўню тэставага задання.

Кожны тэст складаецца з двух відаў заданняў: заданні ЧАСТКІ А і заданні ЧАСТКІ В, якія з'яўляюцца самымі складанымі і, адпаведна, набіраюць найбольшую колькасць балаў. Адказы на заданні ЧАСТКІ В упісваюцца абітурыентам у клетачкі бланка адказаў, колькасць літар у якім не павінна перавышаць лічбу 15.

Аўтары тэставых заданняў не выходзілі за межы праграмы па беларускай літаратуры для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы (Нацыянальны інстытут адукацыі), праграмы ўступных экзаменаў па беларускай літаратуры для ВНУ, школьных падручнікаў.

Кніга адрасавана школьнікам, навучэнцам, абітурыентам.

# ТЭСТЫ

## ТЭСТ 1

*Тэст змяшчае 50 заданняў у частцы А і 10 у частцы В. Заданні прапануецца выконваць у парадку запісу. Калі нейкае заданне не ўдаецца выканаць адразу, лепш перайсці да наступнага. Калі застанецца час, вяртайцеся да заданняў, якія былі прапушчаны.*

### Частка А

*Да кожнага задання часткі А даецца некалькі адказаў, з якіх правільнымі могуць быць адзін, два ці больш. У бланку адказаў пад нумарам задання стаўце крыжык (X) у клетцы, нумар якой роўны правільнаму адказу.*

**А1.** Старажытную літаратуру XI—XII ст. часам называюць літаратурай:

1) Вялікага княства Літоўскага;
2) Рэчы Паспалітай;
3) Кіеўскай Русі;
4) Полацкага і Тураўскага княстваў.

**А2.** Вядучымі літаратурнымі жанрамі Старажытнай Русі былі:

1) верш;
2) слова;
3) паданне;
4) жыціе;
5) прытча.

**А3.** Назавіце вядомыя вам творы Кірылы Тураўскага:

1) «Жыццё Феадосія Пячорскага»;
2) «Слова на вербніцу»;
3) «Слова па Вялікадні»;
4) «Сказанне пра Барыса і Глеба»;
5) «Прытча пра душу і цела».

**А4.** Назавіце свецкае імя Ефрасінні Полацкай:

1) Еўдакія;
2) Святаслава;
3) Гардзіслава;
4) Прадслава;
5) Гарыслава.

**А5.** Ідэйны сэнс «Жыцця Ефрасінні Полацкай» заключаецца ў прапаведзі:

1) асветы;
2) духоўнай дасканаласці чалавека;
3) патрыятызму;
4) спадзвіжніцтва ў імя ідэі;
5) хрысціянскага гуманізму.

**А6.** «Слова пра паход Ігаравы» было напісана:

1) дзесьці ў 1185–1187 гг.;
2) у X ст.;
3) у 1050–1055 гг.;
4) пасля 1202 г.;
5) у XIVст.

**А7.** Назавіце творы (часткі), якія складаюць «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх»:

1) «Аповесць пра Кейстута»;
2) «Сказ пра Альгерда»;
3) «Гісторыя княжання Вітаўта»;
4) «Галіцка-Валынскі летапіс»;
5) «Аповесць пра Падолле».

**А8.** Літаратурна-эстэтычныя погляды Францыска Скарыны заключаюцца ў:

1) імкненні даведацца пра стварэнне свету;
2) арыентацыі на зямную гармонію і прыгажосць;
3) прыхільнасці да рэнесансавага гуманізму;
4) тым, што Біблія — кодэкс хрысціянскай маралі;
5) атрыманні гарадамі Магдэбургскага права.

**А9.** Назавіце тэмы і праблемы паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»:

1) праблема сацыяльнай няроўнасці людзей;
2) любоў да Радзімы;
3) тэма мастака і мастацтва;
4) праблема вернасці ў хрысціянскай сям'і;
5) экалагічныя праблемы.

**А10.** Што аб'яднана ў адно цэлае ў «Дыярыушы» Афанасія Філіповіча?

1) Дарожныя і тлумачальныя запіскі аўтара;
2) успаміны і дзённікі аўтара;